УДК 796.011:796.332-057.177.1

***Уладзімер Паўлавіч Люкевіч***
*канд. філас. навук, дац., дац. каф. спартыўных дысцыплін і методык іх выкладання*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Uladzimier Lukievic***
*Candidate of Philosophical Sciences, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Sports Disciplines and Methods of their Teaching*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: lucul@brsu.by

# ФІЛАСОФІЯ ФУТБОЛА. ПРЭЗІДЭНТЫ ФІФА. ДЭНІЭЛ ВУЛФАЛ

*Артыкул падрыхтаваны на падставе дэскрыптыўнага падыходу з мэтай правесці фенаменалагічны аналіз дзейнасці другога прэзідэнта ФІФА Дэніэла Вулфала па развіцці футбола. Яго намаганні ўвасобіліся ў сацыяльную рэчаіснасць з дапамогай метадалогіі па інтэнсіфікацыі працэсаў распаўсюджвання гэтай гульні ва ўсім свеце. Як і ў кожным відзе актыўнасці, роля асобы ў дадзеным выпадку мела ключавое значэнне, што далей і адбілася ў працэсе фарміравання шэрага арганізацыйных структур на міжнародным узроўні, таму што пасада прэзідэнта ФІФА з'яўляецца адной з найважнейшых у сістэме кіраўніцтва. Немалаважным аспектам у працэсе будучага паступальнага станаўлення футбола было яго філасофскае абгрунтаванне. Суадносіны тактыкі і стратэгіі ўяўляліся вельмі важнымі. Падчас прэзідэнтуры Дэніэла Вулфала гэта садзейнічала выкананню місіі па стварэнні наднацыянальнага футбольнага органа, набыцці міжнароднага аўтарытэту, максімальна шырокім уплыве арганізацыі ў розных напрамках.*

***Ключавыя словы:*** *спорт, футбол, ФІФА, Дэніэл Вулфал, тактыка, стратэгія, міжнароднае супрацоўніцтва.*

## *Philosophy of Football. FIFA Presidents. Daniel Woolfall*

*The article is prepared on the basis of the descriptive approach with the aim of conducting a phenomenological analysis of the activities of the second FIFA President Daniel Woolfall on the development of football. His efforts were embodied in social reality with the help of the methodology for intensifying the processes of spreading this game throughout the world. As in every type of activity, the role of the individual in this case was of key importance, which was further reflected in the process of forming a number of organizational structures at the international level. Because the post of FIFA President is one of the most important in the management system. An important aspect in the process of the future progressive development of football was its philosophical justification. The relationship between tactics and strategy seemed very important. During the presidency of Daniel Woolfall, this contributed to the fulfillment of the mission to create a supranational football body, gain international authority, and the widest possible influence of the organization in various directions.*

***Key words:*** *sports, football, FIFA, Daniel Woolfall, tactics, strategy, international cooperation.*

## Уводзіны

Футбол як сацыякультурны феномен напачатку XX ст. толькі пачынаў сваё імклівае развіццё. Увогуле гэта быў перыяд, калі адбываўся працэс станаўлення цэлага шэрага міжнародных спартыўных арганізацый, сярод якіх футбол яшчэ не выглядаў самым перспектыўным відам спорту ў тагачасным грамадстве. Калі ў 1904 г. па ініцыятыве 28-гадовага французскага журналіста і спартыўнага функцыянера Рабэра Герэна (Robert Guérin) была заснавана галоўная сусветная арганізацыя гэтага віду спартыўнай дзейнасці – ФІФА (FIFA, фр. Fédération Internationale de Football Association; анг. International Federation of Association Football), мала хто мог уяўляць сабе, як далей будуць развівацца падзеі ў гэтым накірунку. Першымі ўдзельнікамі новай асацыяцыі разам з прадстаўнікамі Францыі сталі дэлегаты з Бельгіі, Галандыі, Швейцарыі, Даніі. Пазней да іх далучыліся федэрацыі Іспаніі і Швецыі.

Зразумела, што пасада прэзідэнта ФІФА з'яўляецца адной з найважнейшых у сістэме кіравання, дарэчы, як і ў кожнай самадастатковай арганізацыі. І сапраўды, яна вымагала ад Рабэра Герэна шматлікіх намаганняў у фарміраванні функцыянальнай структуры па развіцці футбола і яго распаўсюджванні па ўсім свеце. Немалаважным аспектам было пытанне стварэння

філасофскай асновы будучага паступальнага станаўлення гэтай гульні. Яму неабходна было падтрымаць наваствораны рух у замацаванні футбола на міжнародным узроўні і вызначыць адпаведны фармат спаборніцтваў паміж нацыянальнымі зборнымі. Суадносіны тактыкі і стратэгіі з’яўляліся найважнейшымі. Але не ўсё выглядала проста і адназначна. Перш за ўсё заставаліся напружанымі адносіны з прадстаўнікамі футбольных асацыяцый Брытаніі, дзе футбол у параўнанні з кантынентальнай Еўропай знаходзіўся на значна больш высо-кім узроўні развіцця як у арганізацыйным і тэхнікатактычным планах, так і адносна матэрыяльнай базы. Затым працяглы час заставаліся нявырашанымі пытанні арганізацыі міжнародных футбольных турніраў на ўзроўні нацыянальных зборных. Гэта, а таксама шэраг іншых прычын прымусілі Герэна ў 1906 г. пакінуць свой пост.

Наступны этап у дзейнасці Міжнароднай федэрацыі футбола пачаўся тады, калі на пост прэзідэнта гэтай арганізацыі заступіў Дэніэл Бёрлі Вулфал (Daniel Burley Woolfall). У перыяд да выбрання на гэтую пасаду Дэніэл Вулфал быў членам Англійскай футбольнай асацыяцыі ад Блэкбэрна, ён асабіста кантраляваў англійскі футбол і частку французскіх клубаў, якія ўваходзілі ў названую структуру.

Афіцыйна абранне Дэніэла Вулфала прэзідэнтам адбылося ў 1906 г. на III Кангрэсе ФІФА ў Берне, калі ён у складзе дэлегацыі прадстаўнікоў з Англіі, Ірландыі, Шатландыі і Уэльса прыняў удзел у гэтым мерапрыемстве. Неабходна ўлічыць, што галоўнай матывацыяй пакінуць пасаду кіраўніка Міжнароднай федэрацыі футбола француза Рабэра Герэна стала тое, што ўсе яго намаганні арганізаваць першыя міжнародныя спаборніцтвы скончыліся нічым.

На пасадзе прэзідэнта ФІФА Вулфал займаўся ўніфікацыяй правіл футбола, прымаў удзел у арганізацыі футбольных турніраў летніх Алімпійскіх гульняў 1908 і 1912 гг. Акрамя міжнародных правілаў футбола, ён таксама распрацаваў асноўныя палажэнні дзейнасці ФІФА, частка з якіх застаецца актуальнай і сёння. Міжнародныя спаборніцтвы былі падзеленыя на клубныя і нацыянальныя. Пры гэтым удзел членаў ФІФА ў іншых міжнародных камерцыйных турнірах забараняўся. Да таго ж Дэніэл Вулфал актыўна займаўся распаўсюджваннем уплыву ФІФА і пашырэннем яе геаграфіі. Праз яго намаганні да міжнароднай федэрацыі далучыліся Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Аргенціна, Чылі і Злучаныя Штаты Амерыкі.

Сын сантэхніка з Блэкбэрна, Дэніэл Вулфал стаў адным з выдатных футбольных адміністратараў. Калі ён яшчэ вучыўся ў гімназіі, то з дапамогай некалькіх вучняў у 1875 г. стварыў футбольны клуб «Blackburn Rovers». І менавіта Вулфал пазней быў прызначаны ў 1881 г. прадстаўніком гэтага клуба ў Футбольнай асацыяцыі Ланкашыра, а праз чатыры гады ён ужо працаваў у футбольнай асацыяцыі акругі. Пасля атрымання адукацыі бухгалтара яму прыйшлося выконваць адпаведныя абавязкі ў якасці падатковага інспектара ў Блэкбэрне, у 1901 г. ён быў прызначаны скарбнікам Футбольнай асацыяцыі. Потым Дэніэл Вулфал займаў пасады ў кіраўніцтве Ланкашырскай футбольнай асацыяцыі і ў Футбольнай асацыяцыі да сваёй смерці ў 1918 г. [3].

Але самая важная падзея ў жыцці Даніэла Вулфала адбылася 4 чэрвеня 1906 г., калі ён быў абраны другім прэзідэнтам ФІФА і адначасова стаў першым англічанінам, які заняў гэтую пасаду.

***Мэта працы.*** Напісанне артыкула на аснове дэскрыптыўнага падыходу мае на мэце зрабіць фенаменалагічны аналіз дзейнасці другога прэзідэнта ФІФА Дэніэла Вулфала па развіцці футбола, а менавіта яго намаганняў па ўвасабленні ў сацыяльную рэчаіснасць новай метадалогіі па інтэнсіфікацыі працэсаў распаўсюджвання гэтай гульні па ўсім свеце. Як і ў кожным відзе дзейнасці, роля асобы ў дадзеным выпадку мела вырашальнае значэнне, што далей і адбілася на працэсе фарміравання іншых арганізацыйных структур на міжнародным узроўні.

***Метады даследавання.*** Філасофская рэфлексія патрабуе вызначыцца з шэрагам адпаведных метадаў даследавання, сярод якіх вылучаюцца такія, як назіранне, апісанне, параўнанне, аналіз і інтэрпрэтацыя навуковых, публіцыстычных і дакументальных крыніц. Важным таксама падаецца вывучэнне і крытычнае асэнсаванне адкрытай у доступе інтэрнэт-інфармацыі. Выяўленыя механізмы і тэндэнцыі ў працэсе апрацоўкі

разнастайных фактаў і фактараў дазваляюць сфармуляваць шэраг заключэнняў.

**Вынікі і абмеркаванне**

Напачатку свайго станаўлення ФІФА сутыкнулася з мноствам праблем, якія неабходна было вырашыць у першую чаргу. Для некаторых іншых арганізацый гэтыя праблемы засталіся непераадольнымі, і таму лёс тых структур быў прадвырашаны: яны так ніколі і не дасягнулі ні грамадскага, ні фінансава-эканамічнага поспеху. У першыя гады свайго функцыянавання Міжнародная федэрацыя футбольных асацыяцый сканцэнтравалася на тым, каб замацаваць сваю легітымнасць у свеце спорту і па магчымасці пашырыць колькасць членаў у вызначаным асяроддзі для таго, каб сфарміраваць такую цэласную струкутуру, якая была б у стане ўзначаліць футбольны рух і далей кіраваць ім на ўсіх кантынентах. Неабходна падкрэсліць, што гэтыя задачы ўсведамляліся даволі дакладна. Таму новая маладая арганізацыя спрабавала зарэкамендаваць сябе як мага хутчэй у якасці аўтарытэтнага футбольнага органа ва ўсім свеце.

Згодна з распрацаванай ФІФА стратэгіяй, напачатку неабходна было атрымаць прызнанне з боку дасведчаных футбольных дзяржаў, і найперш Вялікабрытаніі. Справа ў тым, што менавіта Англійская футбольная асацыяцыя з яе традыцыямі, шырокім уплывам на футбол на кантыненце і ўвогуле ў свеце разглядалася як несумненны ўзор і аўтарытэт. Аднак нежаданне Англіі далучацца да наваствoранай структуры не спрыяла паспяховаму развіццю маладога праекта. Ваганне Англійскай футбольнай асацыяцыі было ў значнай ступені звязана з занепакоенасцю ў тым, што перадача кантролю міжнароднаму органу можа паменшыць веру грамадскасці ў тое, што нязменным стандартам застаецца менавіта англійскі футбол. Таму пэўны час ФІФА не мела падтрымкі з боку Англіі, якая выпрацавала дастаткова дакладныя абрысы сучаснага футбола [6].

На станаўленне Міжнароднай федэрацыі футбола ўплывалі не толькі складаныя адносіны з брытанскімі асацыяцыямі. Трэба браць пад увагу таксама той факт, што ў кожнай краіне былі свае асаблівасці, калі зыходзіць з паняцця разнастайнасці футбольных культур, бо былі ўжо сфарміраваны свае ўласныя падыходы да гульні. Гэта тычылася не толькі яе стылю, але і ўзроўню прафесіяналізму. Аб'яднаць гэта пад эгідай адной арганізацыі было нялёгкай справай. Асаблівыя дыскусіі выклікала пытанне стаўлення да прафесіяналізму. Напрыклад, у Англіі супярэчнасці вырашыліся з моманту заснавання футбольнай лігі, дзе ігракам сталі плаціць. Аднак у большасці еўрапейскіх краін футбол па-ранейшаму заставаўся аматарскім, і сама ідэя прафесіяналізацыі гэтага віду спорту сустрэла супраціўленне.

Нягледзячы на ўсе пералічаныя вышэй праблемы, кіраўніцтва ФІФА было цвёрда настроена на рэалізацыю сваіх амбіцыёзных планаў, каб выканаць сваю місію, набыць аўтарытэт і максімальна пашырыць уплыў арганізацыі. Тут неабходна аддаць належнае Дэніэлу Вулфалу, пад кіраўніцтвам якога ФІФА стала скрупулёзна выконваць тыя напрацоўкі і праекты, якія дазволілі ўсталяваць сваю дамінантную ролю ў футбольным свеце. Брытанец з высокім узроўнем адміністрацыйнай дасведчанасці вызначыўся прагматычным падыходам у сваёй дзейнасці, сканцэнтраваў увагу на пашырэнні колькасці краін у складзе арганізацыі, зрабіў яе больш фармалізаванай. Намаганні ў гэтым накірунку стварылі асновы для ўзнікнення глабальнага спартыўнага саюзу, што не толькі падкрэсліла яго легітымнасць, але таксама ў пэўнай меры забяспечвала адносную фінансавую стабільнасць. Пры гэтым кожны новы ўдзельнік нёс з сабой дадатковыя магчымасці для развіцця міжнародных спаборніцтваў і стандартызацыі правіл. Стратэгія развіцця і распаўсюджвання футбола, якая была распрацавана Вулфалам, прадугледжвала рост колькасці членаў ФІФА не толькі за кошт еўрапейскіх краін. Каб стаць паўнавартасным сусветным лідарам, неабходна было мець прадстаўніцтва з іншых кантынентаў. Так і здарылася, калі на працягу 1910–1913 гг. у склад ФІФА былі прынятыя першыя нееўрапейскія краіны, а менавіта Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Аргенціна, Чылі і ЗША, што стала пачаткам пашырэння арганізацыі ў Афрыцы і Амерыцы. Гэта быў найважнейшы сігнал пра тое, што выбраныя тактыка і стратэгія запрацавалі ў патрэбным накірунку, і футбол пачаў

ператварацца з чыста спартыўнай з'явы ў сацыякультурны феномен.

Аднак на фоне адносных поспехаў трэба звярнуць увагу на камунікацыйныя і матэрыяльна-тэхнічныя цяжкасці каардынацыі з краінамі на розных кантынентах, якія здаваліся яшчэ больш складанымі ў спалучэнні з рознымі ўзроўнямі развіцця футбола ў гэтых рэгіёнах. Узнікалі самыя разнастайныя перашкоды – ад моўных бар'ераў да недахопаў адпаведнай адміністрацыйнай практыкі. Але такое становішча не перапыняла справы па пабудове разгалінаванай сусветнай футбольнай супольнасці. Чым больш краін далучалася да ФІФА, тым хутчэй арганізацыя ператваралася ва ўплывовы цэнтр міжнароднага футболу.

Дэніэл Вулфал таксама ініцыяваў на высокім узроўні сувязі з Міжнародным алімпійскім камітэтам. Гэта дало магчымасць далучыць футбол да праграмы Алімпійскіх гульняў, што, у сваю чаргу, стварыла платформу для дэманстрацыі яго на міжнароднай арэне. З часоў правядзення летніх Алімпійскіх гульняў у Лондане ў 1908 г. футбол нязменна прыцягваў вялікую ўвагу з боку шырокіх колаў насельніцтва. Дарэчы, першы алімпійскі турнір праходзіў з удзелам толькі еўрапейскіх каманд і праводзіўся па правілах аматараў. Але гэта для ФІФА было значным крокам наперад. Турнір прадэманстраваў здольнасць сусветнай футбольнай федэрацыі да арганізацыі і каардынацыі пры правядзенні міжнародных спаборніцтваў і распаўсюджванні гэтага віду спорта ва ўсім свеце.

Яшчэ адной найважнейшай задачай, якая стаяла перад ФІФА ў першыя гады станаўлення, была стандартызацыя футбольных правіл. Адсутнасць іх дакладнай трактоўкі і інтэрпрэтацыі працяглы час заставалася асновай для блытаніны і спрэчак. Прагрэс арганізацыі на міжнародным узроўні залежаў ад таго, наколькі хутка мог быць прыняты агульны стандарт адносна правіл гульні, з якімі пагадзіліся б усе краіны-члены. Працэдура стандартызацыі здавалася складанай і супярэчлівай. Як адзначалася, кожная федэрацыя ў сваёй дзейнасці кіравалася сваімі традыцыямі і нярэдка па-свойму інтэрпрэтавала асобныя моманты, а пошук агульных падыходаў патрабаваў далікатных, дыпламатычных кантактаў. Пытаннем, якое выклікала найбольш вострыя дыскусіі, было трактаванне правіла афсайду, бо яно часам істотна адрознівалася. Напрыклад, па версіі Англійскай футбольнай асацыяцыі, тры абаронцы павінны былі знаходзіцца паміж супернікам і брамай. Але, на думку шэрага іншых прадстаўнікоў, такое становішча абмяжоўвала дынаміку самой гульні. Іншыя федэрацыі прытрымліваліся больш вольнай трактоўкі. Зразумела, што Дэніэл Вулфал павінен быў нейкім чынам спыніць гэтыя рознагалоссі. Ён быў добра знаёмы са спецыфікай англійскага футбола, добра разумеў важнасць кампрамісу. Трэба было ініцыяваць шэраг сустрэч паміж членамі ФІФА па абмеркаванні правіл, каб дасягнуць пэўнага кансэнсусу. Дыскусіі часам праходзілі даволі эмацыянальна, таму што кожны бок імкнуўся абараніць свой ва-рыянт. Але неабходнасць стандартызацыі кодэкса правілаў міжнароднага ўзроўню была прызнана ўсімі, і ў выніку кампраміс быў знойдзены.

Дэніэл Вулфал высока ацэньваў патэнцыял дзейнасці Міжнароднага алімпійскага камітэта, з якім быў зацікаўлены супрацоўнічаць. У выніку на летняй Алімпіядзе 1908 г. у Лондане футбол дэбютаваў у якасці афіцыйнага алімпійскага віду спорту. Неабходна падкрэсліць, што гэта было першае буйное міжнароднае афіцыйнае спаборніцтва, якое прайшло пад эгідай ФІФА, і здарылася яно ўсяго праз чатыры гады пасля ўтварэння самой арганізацыі. Гэта, несумненна, трэба залічыць у актыў крэатыўнай дзейнасці Вулфала не толькі як сведчанне яго лідарскіх і дыпламатычных здольнасцей у вызначэнні месца футбола ў праграме Алімпійскіх гульняў, але і як красамоўны паказчык паскарэння працэсу распаўсюджвання ўплыву Міжнароднай федэрацыі футбола на краіны і кантыненты.

Правядзенне алімпійскага турніру ў Лондане, а затым у 1912 г. і ў Стакгольме адназначна стала вялікім поспехам. Дэманстрацыя здольнасці кіравання міжнародным футболам стварыла неабходныя ўмовы не толькі для далейшага росту папулярнасці самой гульні, але і для таго, каб да арганізацыі сталі далучацца іншыя нацыянальныя федэрацыі.

Аднак футбол, як, дарэчы, і спорт у цэлым, не пазбегнуў адной з самых вострых і балючых канфрантацый – супрацьборства паміж аматарамі і прафесіяналамі, прычым

прафесіяналы сталі дамінаваць. Трэба заўважыць, аднак, што па палажэннях, якія былі распрацаваныя МАК, у Алімпіядах маглі ўдзельнічаць выключна аматары. Гэта яшчэ больш павялічыла напружанасць паміж аматарамі і прафесіяналамі, якая набірала сілу і стала галоўнай праблемай у працэсе арганізацыі ўласнага міжнароднага турніру пад эгідай ФІФА.

Тэндэнцыі дамінавання Міжнароднай федэрацыі футбола і яе ўплыў на адпаведныя структуры па ўсім свеце не засталіся па-за ўвагай спартыўнай супольнасці. Найбольш негатыўнае стаўленне да гэтага працэсу зыходзіла ад Англійскай футбольнай асацыяцыі, якая разам з асацыяцыямі Ірландыі, Уэльса і Шатландыі былі прызнанымі аўтарытэтамі ў гэтай галіне. Трапіць пад кантроль ФІФА для брытанцаў бачылася недапушчальным. Таму трэба адзначыць, што пасля ўтварэння ФІФА ў 1904 г. чатыры брытанскія футбольныя асацыяцыі (Англіі, Ірландыі, Шатландыі і Уэльса) не далучыліся адразу да наваствоaccess санага саюза і станоўча не адрэагавалі на запрашэнне заснавальнікаў ФІФА далучыцца да асацыяцыі, у якой былі прадстаўнікі Бельгіі, Галандыі, Даніі, Іспаніі, Францыі, Швейцарыі, Швецыі [1, с. 245–250]. Неаднаразовыя намаганні Рабэра Герэна па далучэнні прадстаўнікоў Туманнага Альбіёна заставаліся марнымі. Снабізм і фанабэрыстасць брытанцаў пераважалі: яны ўпарта заставаліся на пазіцыі, што футбол на астравах не мае канкурэнцыі. Але адносіны пачалі мяняцца пасля сустрэчы ў Берне ў 1905 г., калі падчас перамоў з членамі-заснавальнікамі брытанцы прынялі мэты ФІФА і пагадзіліся супрацоўнічаць. Сам Вулфал прытрымліваўся думкі, каб Англійская футбольная асацыяцыя і іншыя еўрапейскія футбольныя структуры зразумелі важнасць стварэння міжнароднай арганізацыі, якая, з свайго боку, павінна выкарыстоўваць свой уплыў для рэгулявання футбола на кантыненце як чыстага віду спорту і наладжваць плённае супрацоўніцтва з усімі іншымі асацыяцыямі на падставе шматгадовай брытанскай дасведчанасці. Пасля таго як брытанцы прынялі мэты ФІФА і пагадзіліся супрацоўнічаць, задача Даніэла Вулфала стала заключацца ў тым, каб гэтая дасведчанасць Футбольнай асацыяцыі Англіі стала даступнай для ўсіх кантынентальных асацыяцый [4].

Такім чынам, сітуацыя стала паляпшацца толькі тады, калі Дэніэл Вулфал наладзіў дыялог паміж двума бакамі. Яго прагматычны падыход да вырашэння спрэчных пытанняў дапамог знайсці ўзаемапаразуменне паміж ФІФА і брытанскімі асацыяцыямі. У якасці саступкі прыйшлося пайсці на кампраміс у вырашэнні праблемы стандартызацыі правіл. Так, у 1912 г. праўленне Вулфала дазволіла асобнае членства ўсім чатыром брытанскім асацыяцыям, хоць гэта відавочна не адпавядала статуту. Ён ўпарта настойваў на прыярытэце захавання законаў гульні ў руках брытанскага органа, а менавіта Міжнароднай рады, якая павінна кантраляваць усталяванне правіл гульні. Такім чынам, прадугледжвалася наступнае: незалежна ад магчымай нестабільнасці адносін ФІФА і футбольных федэрацый Вялікабрытаніі важна было стварыць нерэпрэзентатыўную прысутнасць брытанскага футбола ў міжнародным кантэксце і ўлічыць надзвычай працяглы ўплыў брытанцаў на правілы і законы спорту. У выніку адным з найважнейшых дасягненняў Дэніэла Вулфала з'яўляецца яго асабісты актыўны ўдзел у рабоце Міжнароднай рады футбольных асацыяцый (англ. IFAB, International Football Association Board), якая дагэтуль пазіцыяніруецца як галоўная арганізацыя, што займаецца вядзеннем і рэгуляваннем правіл гульні ў футбол. Гістарычна ў яе ўваходзяць прадстаўнікі Англіі, Ірландыі, Шатландыі і Уэльса [7].

Неабходна дадаць, што сама рада была заснаваная яшчэ ў 1886 г. для ўсталявання стандартызаваных правіл або прынцыповых законаў гульнявога працэсу пры правядзенні міжнародных спаборніцтваў і з тых часоў дзейнічае ў якасці асноўнага захавальніка гэтых вызначальных правіл. Трэба падкрэсліць, што ФІФА – галоўны орган кіравання міжнародным футболам – прызнае юрысдыкцыю ІФАБ над сваімі законамі з моманту ўзнікнення. Пры гэтым кожная з чатырох брытанскіх футбольных асацыяцый мае свой голас.

Варта таксама прыняць да ведама, што футбольныя асацыяцыі Ірландыі, Шатландыі і Уэльса доўгі час не маглі атрымаць згоды на членства галоўным чынам з-за таго, што Аўстрыя і Германія выступілі супраць такога рашэння, бо названыя асацыяцыі належалі да адной краіны – Злучанага

Каралеўства. Толькі ў 1912 г. было знойдзена паразуменне (і Дэніэл Вулфал меў да яго самае непасрэднае дачыненне), згодна з якім тры брытанскія футбольныя асацыяцыі былі прынятыя ў ФІФА, хоць гэта супярэчыла статуту самой арганізацыі. Тут таксама неабходна адзначыць асабістую пазіцыю Вулфала па валявым прыняцці рашэнняў на дазвол брытанскім футбольным асацыяцыям вызначаць, трактаваць і інтэрпрэтаваць правілы гульні. Дарэчы, такое становішча захавалася і да цяперашняга часу [4].

Аўтарытэт Дэніэла Вулфала на чале кіраўніка ФІФА паспрыяў таму, што Міжнародная рада футбольных асацыяцый (IFAB) дагэтуль з'яўляецца галоўнай арганізацыяй, якая займаецца вядзеннем і рэгуляваннем правіл гульні ў футбол і пастаянна складаецца з прадстаўнікоў Англіі, Паўночнай Ірландыі, Шатландыі і Уэльса з улікам таго, што падзел Ірландыі на дзве часткі адбыўся ў 1921 г. Цяпер – гэта Ірландская Рэспубліка як незалежная дзяржава і Паўночная Ірландыя як частка Злучанага Каралеўства. Нягледзячы на тое, што правілы гульні адначасова публікуюцца на англійскай, іспанскай, нямецкай і французскай мовах, уплыў Футбольнай асацыяцыі Англіі праяўляецца ў трактоўках тэксту: калі маюцца нейкія разыходжанні і непаразуменні, то прыярытэтным з'яўляецца варыянт англійскай мовы. Брытанскія асацыяцыі (Англія, Паўночная Ірландыя, Уэльс і Шатландыя) маюць у ІФАБ па адным голасе кожная. У той жа час ФІФА, якая ахоплівае астатнія 207 нацыянальных асацыяцый, мае чатыры галасы. Такім чынам, усе пяць органаў забяспечваюць захаванне законаў гульні з павагай да футбольных традыцый, а таксама да міжнароднай рэальнасці. Для прыняцця рашэння па прапанове патрабуецца большасць у тры чвэрці, г. зн. шэсць галасоў з васьмі. Місія ІФАБ – служыць свету футбола ў якасці незалежнага ахоўніка правіл гульні. Як адзіны орган, што ўпаўнаважаны прымаць рашэнні і ўзгадняць змены ў правілах, члены рады пільна сочаць за адпаведнасцю фармальных палажэнняў з улікам іх сутнаснага ўвасаблення з мэтай паляпшэння і развіцця самой гульні для яе ўдзельнікаў, афіцыйных асоб і балельшчыкаў, каб абараніць і замацаваць дух і прастату футбола [5]. Празрыстасць, падсправаздачнасць і інклюзіўнасць – гэта тыя галоўныя каштоўнасці, на якіх базіруецца ІФАБ. Уся сусветная футбольная супольнасць прымае выпрацаваныя дэмакратычным шляхам падыходы і меркаванні, накіраваныя на захаванне сутнасці гульні.

Канцэптуальная матрыца стварэння, фарміравання, развіцця і распаўсюджвання футбола складаецца з шэрага канструктыўных элементаў, якія ўдала спалучыліся ў адзіны пазл у адпаведным часе і адпаведнай прасторы. Гэты від спорту са зразумелымі правіламі імкліва прыцягнуў да сябе ўвагу мільёнаў людзей. Удзел у гульні не патрабаваў ніякай верыфікацыі па крытэрыях нацыянальнасці, веравызнання, адукацыі, узросту, памеру маёмасці і г. д. Для мноства людзей футбол ператварыўся ў сапраўдную рэлігію і разглядаецца як сацыякультурны феномен, які не толькі істотна ўплывае на дзейнасць індывіда, але і мае вялікае значэнне для эканамічнага і палітычнага функцыянавання грамадства [2, с. 44–53].

**Заключэнне**

Адміністратар Англійскай футбольнай асацыяцыі з Блэкбэрна Дэніэл Берлі Вулфал быў абраны прэзідэнтам 4 чэрвеня 1906 г. Галоўнай мэтай падчас яго прэзідэнцтва было выкананне місіі па стварэнні наднацыянальнага футбольнага органа, умацаванні міжнароднага аўтарытэту, максімальным пашырэнні ўплыву арганізацыі па розных накірунках. Таксама ён адыграў важную ролю ў распрацоўцы новай канстытуцыі ФІФА. Несумненным поспехам Вулфала з'яўляецца пагадненне з брытанскімі футбольнымі асацыяцыямі, што ў выніку прывяло да дасягнення кампрамісу ў трактоўцы адзіных правіл футбола на міжнародным узроўні. Ён жа ўсяго праз два гады пасля ўступлення на пасаду прэзідэнта змог арганізаваць першыя вартыя ўвагі міжнародныя футбольныя спаборніцтвы, а менавіта Алімпійскія гульні 1908 г. у Лондане. Яго праўленне ў якасці кіраўніка федэрацыі прывяло да з'яўлення першых нееўрапейскіх членаў ФІФА з Паўднёвай Афрыкі, Аргенціны, Чылі і ЗША. Але, на жаль, усё было спынена пачаткам Першай сусветнай вайны…

Прэзідэнцтва Вулфала скончылася па прычыне яго заўчаснай смерці ў 1918 г. Менавіта ў гэты перыяд надышла да

заканчэння і Першая сусветная вайна. Яе вынікі істотна паўплывалі на ФІФА, зрэшты, як і на ўсе міжнародныя спартыўныя арганізацыі таго часу. Разбурэнні, што былі выкліканы вайной, у спалучэнні з фінансавымі і матэрыяльна-тэхнічнымі праблемамі пасляваеннага перыяду пакінулі ФІФА ў цяжкім становішчы. Працяг функцыянавання Міжнароднай федэрацыі футбола ў нейкі перыяд быў нават пад пытаннем, бо шмат якія з яе членаў былі занятыя аднаўленнем эканомікі сваіх краін і не мелі дастаткова часу і рэсурсаў, каб пачаць займацца футбольнымі справамі.

Месца лідара, якое засталося пасля смерці Дэніэла Вулфала, неўзабаве было занятае Жулем Рыме (Jules Rimet), які ў далейшым стаў адной з самых уплывовых постацяў у гісторыі ФІФА. І ўжо пад яго непасрэдным кіраўніцтвам быў праведзены першы чэмпіянат свету па футболе ў 1930 г. ва Уругваі. Але існуе шмат пацверджанняў, што першапачатковая ідэя падобнага роду спаборніцтва належала Дэніэлу Вулфалу.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Люкевіч, У. П. Філасофія футбола. Прэзідэнты ФІФА. Рабэр Герэн / У. П. Люкевіч // Ценности, традиции и новации современного спорта : материалы III Междунар. науч. конгресса, Минск, 14–15 нояб. 2024 г. : в 3 ч. / Белорус. гос. ун-т физ. культуры ; редкол.: С. Б. Репкин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУФК, 2024. – Ч. 3. – С. 245–250.

2. Люкевіч, У. П. Футбол як сацыякультурны феномен: філасофскія і сацыякультурныя аспекты / У. П. Люкевіч // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 1, Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. – 2022. – № 2. – С. 44–53.

3. Biographical information [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.olympedia.org/-athletes/1202335. – Date of access: 20.08.2024.

4. Daniel Burley Woolfall [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.oxford-reference.com/display/10.1093/oi/authority.20110803124705223. – Date of access: 15.08.2024.

5. Laws of the Game 23/24 / The International Football Association Board. – Zurich : IFAB, 2023. – 230 p.

6. The Formation of FIFA in 1904 [Electronic resource]. – Mode of access: https://footballbh.net/2024/08/19/formation-of-fifa-1904/. – Date of access: 12.11.2024.

7. The IFAB Background [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.theifab.com/-background/. – Date of access: 21.11.2024.

## REFERENCES

1. Liukievich, U. P. Filasofija futbola. Prezidenty FIFA. Rabert Gieren / U. P. Liukievich // Cen-nosti, tradicyi i novacyi sovriemiennogo sporta : matierialy III Miezhdunar. nauch. kongressa, Minsk, 14–15 nojab. 2024 g. : v 3 ch. / Bielorus. gos. un-t fiz. kul’tury ; riedkol.: S. B. Riepkin (gl. ried.) [i dr.]. – Minsk : BGUFK, 2024. – Ch. 3. – S. 245–250.

2. Liukievich, U. P. Futbol jak sacyjakul’turny fienomien: filasofskija i sacyjakul’turnyja aspiekty / U. P. Liukievich // Viesn. Bresc. un-ta. – Sier. 1, Filasofija. Palitalohija. Sacyjalohija. – 2022. – № 2. – S. 44–53.

3. Biographical information [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.olympedia.org/-athletes/1202335. – Date of access: 20.08.2024.

4. Daniel Burley Woolfall [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.oxford-reference.com/display/10.1093/oi/authority.20110803124705223. – Date of access: 15.08.2024.

5. Laws of the Game 23/24 / The International Football Association Board. – Zurich : IFAB, 2023. – 230 p.

6. The Formation of FIFA in 1904 [Electronic resource]. – Mode of access: https://footballbh.net/2024/08/19/formation-of-fifa-1904/. – Date of access: 12.11.2024.

7. The IFAB Background [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.theifab.com/-background/. – Date of access: 21.11.2024.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 08.12.2024*